

# “ПЕСНЯ ПРА ЗУБРА” — СУЧАСНАЕ ПРАЧЫТАННЕ

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі працуе выстава “Мікола Гусоўскі. Песня пра зубра”. Яна прымеркавана да 500-годдзя з часу першага выдання знакамітага твора.

Прадстаўнік эпохі Адраджэння, аматар новалацінскай паэзіі, Гусоўскі стаў адным з заснавальнікаў жанру ліра-эпічнай паэмы ў літаратуры Усходняй Еўропы.

Гусоўскі напісаў “Песню”, калі знаходзіўся ў складзе дыпламатычнай місіі Вялікага Княства Літоўскага. Рабіў ён яе на лацінскай мове па просьбе папы Льва X Медычы, які хацеў больш даведацца пра незвычайную жывёліну. Але Мікола Гусоўскі ў сваім творы «Carmen de statura feritate ac venatione Bisontis» («Песня пра выгляд, лютасць зубра і паляванне на яго») не проста распавёў пра магутнага ляснога волата. Паэма стала гімнам краіне, роздумам над яе лёсам. Ці мог ён тады ўявіць, што гэты твор чакае вялікая слава і што нават праз стагоддзі даследчыкі будуць надаваць яму пільную ўвагу.

Выстава ў “Нацыяналцы” – літаратурна-мастацкая. Тут сабраны выданні і артыкулы з фондаў бібліятэкі, прысвечаныя Гусоўскаму і яго твору. Не адзін раз да твора звярталіся вядомыя перакладчыкі. Так, на выстаўцы пададзены пераклад на беларускую мову Язэпа Семяжона, пераклады на рускую і балгарскую мовы. У 1980 годзе, калі ў Беларусі адзначалася 500-годдзе з дня нараджэння Міколы Гусоўскага, свет пабачыла выданне “Песні пра зубра” на лацінскай, беларускай і рускай мовах. Тады ж імя паэта і яго дзень нараджэння былі ўнесены ЮНЕСКА ў міжнародны каляндар памятных дат.

Сюжэт паэмы не раз спрабавалі пераасэнсаваць знакамітыя беларускія мастакі – Арлен Кашкурэ-











віч, Міхаіл Басалыга, Барыс Забораў, Уладзімір Савіч і многія іншыя. Выданні з іх ілюстрацыямі і асобныя аўтарскія эстампы таксама пададзены на выстаўцы.

На экспазіцыі прадстаўлена кніга ручной работы з гравюрамі ў тэхніках афорта і меца-тынта мастака Юрыя Якавенкі. Гэта ўнікальнае спалучэнне літаратуры і выяўленчага мастацтва. Кніга выканана ў элітарным кірунку кніжнага мастацтва. Яна надрукавана на паперы ручной работы (якая ствараецца па тых жа тэхналогіях, што былі ў Сярэднявеччы), яе вокладка зроблена з натуральных матэрыялаў.

Сваім бачаннем твора Гусоўскага падзяліліся выкладчыкі і студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і гімназіі-каледжа імя І.В. Ахрэмчыка. Незвычайная эпічная паэма і сёння натхняе на стварэнне цікавых твораў. У экспазіцыі прадстаўлена больш за 45 работ двух дзясяткаў аўтараў. Яны выкананы ў розных тэхніках, у лічбавым і высокім друку, жывапісе, графіцы, у каліграфіі, ёсць тут і партрэты, і сюжэтныя экспазіцыі.

Цікава, як у работах перададзена сувязь часоў і сімвалаў. Мастакі эксперыментуюць са шрыфтамі, спалучаюць выяву зубра з радкамі твора, напісанага паўтысячагоддзя таму. Тут можна пабачыць інтэрпрэтацыі тытульнага ліста, ілюстрацыі, якімі можна было б аформіць у будучым новыя выданні "Песні пра зубра". Да ўдзелу ў выстаўцы былі запрошаны і кітайскія студэнты, яны паспрабавалі пры дапамозе кітайскіх іерогліфаў перадаць сваё ўяўленне пра "беларускага бізона".

Яўген **Кручкоў**

Фота Лізы Голад